# І танец, і спектакль

**Адным з самых яркіх удзельнікаў фестывалю быў ансамбль кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Маладзёжную аўдыторыю падкупілі яго тэатральна-танцавальныя эксперыменты.**

Выкананне геаметрычных танцавальных пераходаў на сцэне сёння наўрад ці здзівіць маладзёжную аўдыторыю. Гэта добра ведае Святлана Вячаславаўна Гуткоўская, стваральнік і кіраўнік ансамбля, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры харэаграфіі, прафесар БДУКіМ. Яе калектыў, выходзячы на сцэну, не адпускае гледача ні на секунду, інтрыгуючы і завarожваючы тэатральным дзействам. На гэты раз юнакі і дзяўчаты адправіліся "Па яблыкі".

За амаль 30 гадоў свайго існавання ансамбль стаў сапраўднай лабараторыяй сучаснага беларускага танца. Прычым эксперыментуюць у гэтай лабараторыі не толькі педагогі, але і студэнты.

— Удзельнікі нашага ансамбля не толькі танцуюць — яны самі і ставяць свае нумары, — гаворыць Святлана Гуткоўская. — Балетмайстарскія ўменні развівае ў сабе кожны студэнт, і гэта вельмі патрэбная якасць. Дысцыпліну "Мастацтва балетмайстра" я выкладаю з 1984 года. Гэты выпуск у мяне васямнаццаты. Дыпломныя работы застаюцца жыць у калектыве і пасля выпуску іх аўтараў, складаюць наш залаты фонд. Бо акадэмічная група — гэта мадэль будучага творчага калектыву. Нашы студэнты вучацца ў ёй ствараць рэпертуар, удзельнічаюць у праектах, выступаюць у ролі рэпетытара, пастаноўшчыка. Я не страчваю сувязі са сваімі выпускнікамі. Яны прыходзяць да нас нават праз гады і ставяць свой жа нумар, але з улікам індывідуальнасцей, тэхнічных і артыстычных магчымасцей удзельнікаў ансамбля. У прыватнасці, кампазіцыю "Па яблыкі" стварыла 10 гадоў назад студэнтка Карына Хомбак. Да яе мы звярнуліся толькі ў гэтым годзе.



Усяго ў рэпертуары ансамбля каля 40 кампазіцый. Святлану Вячаславаўну часта просяць аддаць гэтыя нумары, але яна не паддаецца на ўгаворы.

— У кожным з нашых нумароў абавязкова ёсць пошук, зместавы элемент, задума, а не проста прыгожыя геаметрычныя перастраенні ў прыгожым касцюме. Нават класічныя творы — "Крыжачок", "Лявоніха" — мы падаём у сучасным прачытанні. Бо мастацкая думка ўвесь час развіваецца, мяняюцца мастацкія густы, ды і час уносіць свае карэктывы і ў музычны матэрыял, і ў касцюм, і ў падбор пластычных элементаў. Яны павінны адпавядаць часу.

Асобны кірунак у пастаноўках ансамбля — фальклорныя спектаклі. Іх асновай становяцца матэрыялы архіўных экспедыцый, у якія некалі мы, студэнты, адпраўляліся па ўсёй Беларусі на цэлы месяц кожнае лета. Іх мы цяпер аднаўляем і ставім спектаклі — з песнямі, прыказкамі, прымаўкамі, жартамі. Ёсць у нас і народна-сцэнічны танец, танец у стылі фолк-мадэрн, у якім аб'ядноўваюцца сюжэты, вобразы, асноўныя рухі з народнага танца, але яны апрацоўваюцца ў кірунку мадэрн. Гэта адлюстроўваецца і ў стылістыцы, і ў пошуку касцюмаў.

Яшчэ адна адметнасць калектыву — ён не выкарыстоўвае для сваіх нумароў песні. На погляд кіраўніка, песні — самакаштоўныя творы, якія не патрабуюць ілюстрацыі. А вось музычны матэрыял беларускіх гуртоў, якія працуюць у стылі фолк-ф'южн ці фолк-мадэрн, тут вельмі запатрабаваны.

Павел Стрэльчанка яшчэ 10 гадоў назад быў студэнтам БДУКіМ і ўдзельнікам ансамбля кафедры харэаграфіі. Сёння ён ужо старшы выкладчык кафедры харэаграфіі БДУКіМ, харэограф-рэпетытар гэтага ансамбля і працуе ў тандэме са Святланай Вячаславаўнай:

— У нашым ансамблі захоўваецца пераемнасць. Тыя выпускнікі, якія становяцца педагогамі, перадаюць свае веды, уменні ўжо маладому пакаленню. За кошт новых удзельнікаў наш калектыў абнаўляецца фізічна, але духоўна ён застаецца тым жа. У гэтым наша ўнікальнасць. А яшчэ мы ганарымся атмасферай унутры калектыву. Мы як адна вялікая і дружная сям'я. Калі адно аднаго адчуваеш, табе лёгка на рэпетыцыях, ты ўжо ведаеш, чаго ад цябе чакаюць. Не страчваецца гэтае адчуванне еднасці і праз гады і нават дзесяцігоддзі.

> Артысты выконваюць харэаграфічныя кампазіцыі, у якіх беларускі фальклор спалучаецца з сучаснымі тэхнікамі і кірункамі ў танцы. Пры гэтым у аснову сюжэтаў кладуцца міфы, легенды і казкі беларускага народа і выкарыстоўваецца музыка сучасных беларускіх гуртоў, якія працуюць у стылі фолк-мадэрн ці фолк-ф'южн.